СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЖНІЎНЯ 2017 г. АЎТОРАК №150 (28514)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Дзе збіраюць сапраўдны беларускі «Кадылак»?



У пошуках тульскіх скарбаў



Як прайшоў «Рыцарскі фэст – 2017»

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Іпатэчнае крэдытаванне ў Беларусі можа запрацаваць на працягу года. Цяпер дапрацоўваюцца механізмы рэгулявання некаторых пытанняў — у прыватнасці, механізм канфіскацыі жылля ў тым выпадку, калі чалавек не можа выплачваць іпатэку. Важна, як будуць канфіскоўвацца кватэры пры немагчымасці пагашэння доўгу. Гэтае пытанне будзе хутка дапрацавана, думаю, гэта перспектыва аднаго года. Хачу адзначыць, што перад галіной стаіць таксама задача па зніжэнні сабекошту будаўніцтва. Кошт квадратнага метра па дзяржпадтрымцы — 840 рублёў, наша задача выйсці на паказчык, пры якім кошт квадратнага метра будзе роўны сярэдняй заработнай плаце, мы блізкія да яго».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9508 | ▲ |
| Еўра | 2,2993 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0757 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17150>

Жывіце ўбяспецы!

# САБРАЦЬ І ЗБЕРАГЧЫ

## Пазбегнуць надзвычайных сітуацый на ўборцы





Фота Надзеі БУЖАН.

**Жніво зараз у самым разгары. Аднак варта не толькі ўбраць, але і зберагчы збожжа. Датычыцца гэта як палёў, так і зернесушыльных комплексаў. Карэспандэнты «Звязды» выехалі ў рэйд разам з супрацоўнікамі Мінскага раённага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, каб пабачыць, як жа гэта робіцца.**

### «На пачатку нулявых знайсці вогнетушыцель у кабіне было цяжка»

Бяскрайнія палі зіхацяць жоўтым колерам. Паблізу вёскі Табары ўбіраюць рапс. Аднак гэтай раніцай 21 камбайн агракамбіната «Дзяржынскі» пакуль што стаіць на прыколе. Уначы прайшоў даволі моцны дождж, таму механізатары чакаюць, пакуль сонца падсушыць палеткі. І разам з тым аглядаюць сваю тэхніку.

— Першапачаткова ўсе спецыялісты, занятыя на ўборцы ўраджаю, праходзяць інструктаж па тэхніцы бяспекі на прадпрыемстве, — кажа **начальнік Мінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Дзяніс ЖЫЛКО.** Нашы супрацоўнікі штодня наведваюць месцы ўборкі і нагадваюць аб правілах пажарнай бяспекі падчас жніва. Мы звяртаем увагу на тыя часткі камбайна, якія круцяцца і труцца — яны і з'яўляюцца пажаранебяспечнымі. Жняярка забіваецца за некалькі гадзін работы, таму ў камбайне абавязкова павінна быць рыдлёўка для яе ачысткі. Акрамя таго, мы правяраем, каб не падцякалі масла і паліва. І, зразумела, правяраем наяўнасць сродкаў сувязі і вогнетушыцель.

Як толькі звяно камбайнаў выходзіць у поле, там абавязкова пачынае дзяжурыць пажарны аўтамабіль. З усімі вадзіцелямі падтрымліваецца мабільная сувязь. Па рэгламенце, калі механізатар убачыць, што недзе пачаў курыцца дымок, ён павінен выклікаць нашу машыну. Аднак здараюцца нештатныя сітуацыі даволі рэдка.

— Рапс, які мы ўбіраем, адразу стагуецца, а следам збіраецца і салома, — заўважае **начальнік аддзела працы і тэхнікі бяспекі агракамбіната «Дзяржынскі» Дзяніс ЛЯВЕР.** — Пажніўныя астаткі заворваюцца ў гэты ж дзень. Тым самым мы вырашаем адразу некалькі задач. Па-першае, пажніўныя астаткі загарэцца ўжо не могуць. А па-другое, мы атрымліваем дадатковае ўгнаенне. Што да дзяжурстваў пажарных аўтамабіляў, то кіраўніцтва кожнай гаспадаркі само вырашае, ці заказваць ім гэтую паслугу. Мы вырашылі заключыць дагавор найму з Мінскім раённым аддзелам па надзвычайных сітуацыях — нам так і прасцей, і спакайней. Ды і калі методыка ўжо адпрацавана, то людзі ведаюць, што рабіць пры нештатных сітуацыях.

СТАР. 4

■ Фармацэўтыка

# ФАЛЬСІФІКАТ? ГЭТА НЕМАГЧЫМА

## На айчынным рынку прадстаўлена толькі якасная фармацэўтычная прадукцыя

**У нашай аптэчнай сетцы немагчыма купіць фальсіфікат. Калі мець на ўвазе легальны гандаль, то такія лекі трапіць у яго проста не могуць. Іншая рэч, шмат безрэцэптурных лекаў прадаецца цяпер праз інтэрнэт — і тут можна, што называецца, трапіць...**

З аднаго боку, легальны інтэрнэт-продаж лекаў сапраўды існуе, адпаведная практыка дзейнічае ў шэрагу краін. Гэта азначае, што ліцэнзаваная аптэка замежнай краіны зарэгістравалася на сайце ўпаўнаважанага органа (напрыклад, міністэрства аховы здароўя) і атрымала спецыяльны знак. Выйсці на такую аптэку можна непасрэдна з сайта таго самага органа аховы здароўя. Аднак ведаюць аб гэтым далёка не ўсе, чым і карыстаюцца некаторыя несумленныя грамадзяне. Прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя Беларусі не так даўно адшукалі ў інтэрнэце незарэгістраваны ў нас сродак для лячэння эрэктыльнай дысфункцыі — прапаноўваў яго адзін расійскі сайт — і вырашылі правесці кантрольную закупку.

СТАР. 4

Да 100-годдзя «Звязды» застаўся 1 дзень

На ўсе 100!!!

100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна.
Заставайцеся з намі – будзе цікава!
Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.